**І.М. Яраш**

# СПОСАБЫ ЎТВАРЭННЯ АКАЗІЯНАЛЬНЫХ НАЗОЎНІКАЎ (на прыкладзе вершаў Рыгора Барадуліна)

У творах сучасных беларускіх паэтаў можна знайсці шмат слоўнаватвораў. Асабліва часта звяртаюцца да такіх словаў Р.Барадулін, В.Зуёнак, П.Панчанка і многія іншыя паэты.

У артыкуле на матэрыяле больш за 100 казіянальных назоўнікаў са зборнікаў вершаў Р.Барадуліна аналізуецца іх словаўтваральная структура.

Разнастайныя па семантыцы і ўтварэнню аказіянальныя назоўнікі можна падзяліць на 3 групы: 1) назоўнікі, якія ўтварыліся на аснове прадуктыўных словаўтваральных мадэляў; 2) назоўнікі, утвораныя па непрадуктыўных і малапрадуктыўных тыпах; 3) назоўнікі, утвораныя нетыпова –па аказіянальным тыпах.

Адным з самых актыўных спосабаў утварэння аказіяналізмаў у сучаснай беларускай мове з'яўляецца суфіксацыя. Суфіксальныя аказіяналізмы ўтвараюцца па аналогі з рэгулярнымі прадуктыўнымі ўтварэннямі па існуючых прадуктыўных мадэлях. Аналіз вершаў Рыгора Барадуліна паказвае, што найчасцей ім выкарыстоўваюцца наступныя суфіксы *-інк-/-ынк, -асць, -ін-/-ын-, -к-, -ік-/-ык-* і інш.

З дапамогай суфікса *-асць* ад якасных ці адносных прыметнікаў або назоўнікаў утвараюцца назоўнікі са значэннем адцягненай прыметы якасці, названага матывіруючай асновай: скрыплівы – ***скрыплівасць***, няўмольны – ***няўмольнасць***, неадумны – ***неадумнасць***, голазады – ***голазадасць***, нямы – ***немасць***, ***світальнасць***, ***сутасць***, ***выжласць***, ***мінучасць***, ***спрагнёнасць***: *Жывы ў здрадным плоцевым грыме Спяшаецца, вязень вярсты, А змоўкне – І дол яго прыме, Бо з прахам* ***няўмольнасць*** *на ты*; *У краіне лайдакоў, Дружных радасцю, Дзеляцца спакон вякоў* ***Голазадасцю***; *І дамавіна Рупнасць тваю ацаніць павінна. У* ***немасці*** *сценаў Дазваляеш багаславіцца.*

Актыўна выкарыстоўваецца пры ўтварэнні аказіянальных назоўнікаў суфікс *-к(а)*. Семантыка гэтых слоў даволі разнастайная: гэта назвы асоб жаночага полу і неадушаўлённых прадметаў. Матывіруюцца яны асновамі назоўнікаў мужчынскага роду: ***лунацік*** – лунатка, ***павадыр*** – павадырка: *Узмежкам, павадком, лядком За словам быкаўскім, Радком, Не ўзяўшы ў* ***павадыркі*** *стому, Іду, Вяртаюся дадому..*; асновамі прыметнікаў і дзеясловаў: не чакаць – ***нечаканка***.

Неадушаўлёныя назоўнікі з суфіксам *-інк-/-ынк* выражаюць пэўныя абстрактныя паняцці памяншальна-ласкальным адценнем: ***альтанчынка,***

***папялінка***, ***жарсцвінка***, ***імшынка***, ***хламідзінка***: *І полымя болю маму ўзяло – Растала, як **папялінка**, за хмарамі*; *Калі апошні міг Адлічыць мне Апошняя **жарсцвінка** прыпамінаў, Адчую – Свет бацькоў мяне пакінуў, Пясчынкай стану роднай старане*; ***Хламідзінка*** *з корту пацёртага, Жудасцю не абдымай!*

З суфіксам -*ачк*- выяўлены наступныя аказіянальныя назоўнікі: ***хохмачка***, ***ласачка***: *З барадатага анекдота розных Наіўнасць святая **Хохмачак** насукала...* Утвораны яны ад асноў назоўніка і прыметніка са значэннем асобы ці прадмету жаночага роду.

Даволі актыўна выкарыстоўваецца пры ўтварэнні назоўнікаў -*ін*-/-*ын*-: ***саксауліна***, ***лугавіна***, ***хмурына***, ***стажына***, ***чарупіна***, ***пярліна***, ***краміна***, ***дзвярына***: *Каб злюцець – Ледзь тузані Адну саксауліну, Згінуць злыдні, Як авадні!*; *За далягляд наважваешся, А ўжо стаіш на адхоне, Цень на **лугавіне** спрадвечча, Чалавеча*; *Ты, як перад дажджом трава, І я міжволі адчуваю, Як адплывае галава, Яшчэ мая. А дажджавая **Хмурына** заплыла ў мяне – І ўжо шалее навальніца. Траве ў **стажыне** ў душным сне Раса сцюдзёная прысніца; Брама ў святло і ў свет, **Дзвярыны** пасляваенныя, Апошні раз зачыніцца Не спяшайце за мной – Прашу.*. Утвараюцца яна ад асновы назоўніка, суфікс -*ін*-\-*ын*- надае словам значэнне прадмета або асобы, якія належаць да сукупнасці аднародных прадметаў або асоб, або звязаны з ідэяй павялічвання: ***пер’іна*** – пер’інка: *На ты лепей з Богам і з маці, Чужое, халоднае Вы, Як тыя пустыя палаці, Дзе ні **пер’іны**, ні травы.*

Да гэтай жа групы прымыкаюць словы з суфіксам -*ін/я/,* утвораныя ад асновы назоўніка: ***пінгвіня***, ***хіпіня***: *Пінгвін на ільдзіне радасны Пад пахаю **пінгвіня** Трымае, Як ранішні градуснік...*; *Вясёлага хапіла Чагосьці, Бо ўсю ноч Вясёлая **хіпіня** Танцуе басанож.* Яны называюць асоб жаночага полу.

Пры дапамозе суфікса -*ік*-/-*ык*- утвораны аказіяналізмы ***ручасцік***, ***часцік***, ***намерык:*** *Ад намеру да **намерыку**, Як ад прорвы да калодзежа.* Слова намерык атрымала пры гэтым стылістычна-зніжаную афарбоўку.

З суфіксам -*нік* сустрэліся наступныя аказіяналізмы, утвораныя ад асноў назоўніка: помста – ***помснік***, і прыметніка: наступны – ***наступнік***: *Вышэй ад пірамід Кастры народных **помснікаў**.* Гэтыя словы маюць значэнне асобы, якой уласцівы стан, названы матывіруючай асновай.

З суфіксам -*ніц*- адзначаны аказіянальныя назоўнікі жаночага роду, якія абазначаюць асоб у іх адносінах да прадмета, названага матывіруючай асновай: ***курортніца*** – курорт, ***пляжніца*** – пляж: *Пенсіянеру-дубу сніцца Чынара – Улюбёнка гор. Курортніцай сараматніца Здымае Свой хіповы*

*ўбор*; *На* ***пляжніцы*** *З крамяным станам Сукенка модная ліпіць Перапялёсістым бананам, Што толькі пачалі Як бы да “бананачкі” Папрасіцца ў took?!*; *Мама мая хрысціянкай зжыла, З богабаязнай душою, іконніцай. Ды, вернападдадзеная святла, Болей была яна* ***Вогнепаклонніцай***.

У прааналізаваным матэрыяле сустрэўся назоўнік з суфіксам *-ан/я/*: ***адамяня***: *Адаму даў адну спакусу,* ***Адамяняй*** *раз’ела зло*, матываваны імем уласным. Аказіянальныя назоўнікі з гэтым суфіксам састаўляюць назвы дзяцін жывёл, маюць экспрэсію ласкавасці.

Суфікс *-j(о)/-j(о)* выяўлены ў слове ***вудаўё***: *Праменем ляшчыны* ***Вудаўё*** *З бацькавай рукі Цябе прасвечвала*, якое мае зборнае значэнне.

Цікавымі з’яўляюцца ўтварэнні з іншымі, менш прадуктыўнымі суфіксамі. Вось прыклады новаўтварэнняў з суфіксам *-ых-*, якія называюць самак жывёлін і ўтварыліся ад назоўнікаў мужчынскага роду: ***вужыха***, ***камарыха***: *Прыкметы горай ад вужых Сіпяць старанна: Хто на падушках спіць чужых, Лысее рана*; *Хаця кусае* ***камарыха****, Абэлка ўся на камара!* Сустрэўся назоўнік з суфіксам *-ух-:* ***бягуха***: *А святлом да святла прабіцца З паднявольнае глухаты Можа толькі Бягуха крыніца Ды яшчэ, мама вечная, ты*, які ўтвораны па той жа мадэлі і называе асобу жаночага полу. Яшчэ адзін непрадуктыўны суфікс *-б-* сустрэўся ў словах ***тварба***, ***пасьба***, ***старба***, ***харашба***: *Я дбаў, Як быў* ***тварбой*** *заняты, Пра дух, Не забываў пра плоць*; *Веяцьме час малады ў* ***старбе*** *Кожную хвілю праз сітца*; *Тут, дзе ў пустой* ***пасьбе*** *Вальней святым каровам, След глянуць на сябе Нам, быццам бы здаровым*; *У* ***харашбе****, У варажбе Усю святую Да хвіліны Я выцісну цябе з сябе, Як выціскаюць яд змяніны.* Утвораны яны ад дзеясловаў *пасці, тварыць, старэць, харашэць.*

Прэфіксальны спосаб пры ўтварэнні аказіянальных назоўнікаў выкарыстоўваецца менш. У прааналізаваным матэрыяле часцей сустракаўся прэфікс *анты-*: ***антыяйкі***, ***антыбайка***, ***антыпара***, ***антытвар***: *Зязюлі хацелася надта Наседзець самой* ***антыяйкі****, Каб вывесці антыпернатых Для* ***антыбайкі***; *Прыйшла да антыквара З вяселля* ***антыпара****: – Калі ўжо антыквар ты, Прадай нам* ***антыкварты****... Пайшлі. Жахнуўся антыквар – Прапаў ягоны* ***антытвар****!*

Нязначнае месца займае ў сістэме словаўтварэння і прэфіксальна-суфіксальны спосаб. Гэтым спосабам утвораны такія назоўнікі як ***падшэфак***, ***завейнік***, ***адмеліна***, ***прыглядка***: *А пакуль няма Вятроў-****завейнікаў****, Што перапаўзуць мяжу, З вішша навяжу Бухматых венікаў.*

Вельмі прадуктыўным спосабам утварэння новых назоўнікаў з’яўляецца складанне. Паводле сэнсавых адносінаў паміж кампанентамі складаныя назоўнікі падзяляюцца на дзве групы – са спалучальнымі адносінамі асноў і з падпарадкавальнымі адносінамі асноў [4, с. 316]. У першай групе матывіруючыя асновы выступаюць як раўнапраўныя паводле сэнсу, напрыклад, ***жаўталес***, ***пашлапень***, ***белакужаль:*** *Паспець усё зрабіць, і ў час сысці, Не затрымаўшыся ні на хвіліну, І ціха легчы ў* ***жаўталес*** *ці ў гліну, Такое розніцы, як і ў жыцц: Ці смелай ложкай боўтацца ў гусці*; *Не паспелі наткаць* ***белакужалю*** *кросны, Тлеў Балюча туман Зраненай цішыні.* Да другой групы назоўнікаў з падпарадкавальнымі адносінамі можна аднесці такія слов як ***авіяхмарка***, ***аэрапрызба***, ***кіна-***, ***фотавочы***, ***мікраэдэм***: *Выбег ад* ***аэрапрызбы*** *Дрогкі бетонны дыван; Усё змізарнела і здрабнела, Абмацанае* ***Кіна-*** *і* ***фотавачмі...***

Актыўна выкарыстоўваеца пры ўтварэнні аказіянальных назоўнікаў нульсуфіксальна-складаны спосаб: ***зімавея (зіма+веяць)***, ***веснавея***, ***снегавей***, ***крэслацёр***, ***градабой***, ***дабрасей:*** *І па хвалях ішла ці плыла, як плотка, у белым кажусе, у белай хусціне, лёгкая на ўспаміне, Зімавея – крамяная цётка*; *Ураджай, недарод,* ***Градабой*** *– на народ, Гнеў і ласка зямлі і неба...*

Таксама сустракаюцца назоўнікі, утвораныя нетыпова: спосабам кантамінацыі, міжслоўнага сумяшчэня або фанетычным афармленнем утвараючых кампанентаў. Пры міжслоўным сумяшчэнні на канец асновы аднаго слова накладаецца аманімічны пачатак другога, напрыклад, ***скупень (скуп-ы+пень):*** *Выскачыў з канапель Пiлiп-пашлапень. Узелянелае лісце Расквакалася рапенькамі. Лысы, як поўня, Пень-****скупень*** *Хоча выпендрывацца апенькамі.* У некаторых выпадках утварэнне новага слова адбываецца двайным спосабам (тэрмін І.С. Улуханава: 7, с. 62). Напрыклад, міжслоўнае сумяшчэнне са скарачэннем***: ранетадром (ранет+ра-к-етадром)***, ***вакаём (вока+ва-д-аём)***, ***Іматраархат (Іматра+матр-ы-архат): З ранетадрома*** *стартуе лета*; *Вясёлкі кола,* ***вакаём****, Мерыдыян залатаскабы – У завушніцы пазнаём, І позірк робіцца ласкавы*; *Радкі з сасноварэбрых хат Да вадаспаду давыкалі – Валодаў* ***Іматраархат*** *Пячорамі, ледавікамі.* Пры фанетычным пераафармленні асобныя часткі слова замяняюцца: ***імгла+ігла-тэрапія=імглатэрапія.***

Прааналізаваны матэрыял сведчыць пра багацце і разнастайнасць індывідуальна-аўтарскіх назоўнікаў у сучасным паэтычным маўленні. Што датычыцца структуры такіх слоў, то ўтвараюца яны па аналогіі са словамі прадуктыўных і малапрадуктыўных тыпаў ці па аказіянальных мадэлях. Вывучэнне словаўтваральнай структуры аказіяналізмаў дае магчымасць не

толькі разгледзець стылістычна-вобразныя функцыі аказіяналізмаў, а і выявіць тэндэнцыі развіцця словаўтваральнай сістэмы мовы.

**Літаратура**

1. Барадулін Р. Вечалле: Кніга паэзіі. Мінск: Маст. літ., 1980. 336 с.
2. Барадулін Р. Выбраныя творы: У 2-х т. Т. 1. Мінск: Маст. літ., 1984. 415 с.; Т. 2 Мінск: Маст.літ., 1984. 335 с.
3. Басова А.И. Окказиональные слова в современной белоруской художественной речи: Автореф. дис. ... канд. филол. наук:10.02.02 / Бел. гос. ун-т. Мн., 1981. 24 с.
4. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. / АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я.Коласа. Мінск: Нав. і тэхн., 1985. 431 с.
5. Чарнаброўкіна Н.У. Аказіянальныя словы ў складзе лексічных сродкаў сучаснай беларускай паэзіі: Аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / Бел. дзярж. ун-т. Мінск, 1998. 14 с.
6. Лопатин В.В. Рождение слова: Неологизмы и окказиональные образования. М.: Наука, 1973. 152 с.
7. Улуханов И.С. Единицы словообразовательной системы русского языка и их лексическая реализация. М., 1996. 215 с.